Год выдавецтва II. ЦАНА НУМАРУ 30 гр.

ПРАВАСЛАЎНАЯ БЕЛАРУСЬ

Царкоўна-грамадская і палітычная часопісь.
(Орган Праваслаўнага Беларускага Дэмократычнага Аб'яднаньня).
(Выходзіць 3 разы ў месяц).

№ 5 (11) | 16 ЛЮТАГА. | 1928 г.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ:	ПАДПІСНАЯ ЦАНА:	ЦАНА АБВЕСТАК:
Вільня, Гэтманская вуліца № 4, кв. 16.	на 1 месяц: 80 гр на 3 месяцы: 2 зл. 00 —.	на 1-шай старонцы 30 гр., пасярод тэксту 25 гр., на апошняй старонцы 20 гр, за рад. пэтыту.

АД РЭДАКЦЫІ. № 4 (10) нашай часопісі „Праваслаўная Беларусь“ ня быў разасланы зусім нашым падпішчыкам з прычыны канфіскаты яго праз КамісарыятУраду ў Вільні за дзьве стацьці 1) „Блёк меншасьцяў“ і „Блёк спулпрацы з жондам“ і 2) „Сумная гадаўшчына“ (аб Смарагдзе Латышэнцы).

З гэтай прычыны, каб не рабіць вялікага перарыва, № 5 (11) выпускаем троху раней: замест 20-га, — 16-га лютага. Наступны нумар выйдзе 25-га лютага.

Мы і „Р. Н. О.“

«Русскія» (праз два «с») арганізацыі на папярэдніх выбарах у Сойм і Сэнат у 22-м годзе, як ведама, ішлі на выбары разам з беларусамі і украінцамі у «Блёку нац. меншасьцяў». У гэты раз яны у «Блёк» не увайшлі і, стварыўшы сваю палітычную арганізацыю РНО (Русское Народное Об'единеніе), ідуць на выбары з асобным сьпіскам пад № 20.

У адным з папярэдніх нумароў нашай «Праваслаўнай Беларусі» мы ўжо гаварылі аб прычынах неўва-

ходу ў «Блёк» прадстаўнікоў РНО (гл. № 3, артыкул „Нацыанальны Склад Блёку"), выясьняючы, што віна ў гэтым зусім не наша, а іхняя. Ня гледзячы на гэта „РНОўскія" газэты прадаўжаюць нападаць на Беларусаў, то папракаючы нас у тым, што мы іх да Блёку ня прынялі, то хаючы нашую працу і зцьверджаючы, што з намі „не па дарозе".

У адным гэтым ужо чуецца праціварэчые, а гэта знача—няпраўда.

Калі ім з намі не падарозе, дык чаго-ж яны тады „прасіліся", як самі кажуць, у „Блёк"? Чаго-ж тады і жаліцца, і крыўдзіцца на нас, што. „Наша працягнутая рука асталася вісець у паветры". Нечага было яе і працягаваць, калі вам было „не падарозе". Няма чаго тады і лаяць цяпер тых самых беларускіх дзеячоў, да спаўпрацы з якімі цягнулася вашая рука.

Наадварот, мы, як ужо гэта і выясьнена крыху у ўспямянутым артыкуле, не цягнуліся дужа да РНО, але і ня крыўдзімся на тое, што яны не пайшлі з намі.

Гэта ня дзеля таго, што мы варожа адносімся (Божа барані!) да „рускога" (праз два с) народа. Наадварот, мы уважаем яго за адзін з бліжэйшых да нас славянскіх народнасьцяў і па крыві, і па веры, і па культуры, але-ж мы ня думаем, што РНО ёсьць добрым прадстаўніком узапраўдных імкненьняў русскага народа.

Дзеля гэтага мы ў 22-м годзе з радасьцю спаткалі аб'яднаньне з рускімі ў супольны „Блёк", выдавалі нават для іх і адозвы на расейскай мове, заклікалі да спаўпрацы з намі расейцаў і праваслаўных, і стараабрадцаў. І „народ', ніжэйшыя слаі „русскіх" ахвотна ішлі з намі. Але-ж і тады ўжо выявілася, што пэўная частка „русскіх",—як раз з былых вышэйшых клясаў,—дваран, цамешчыкаў, быўшых высокіх чыноўнікаў людзей з вялікім гонарам,—з пэўным „презрэньнем" адняслося да нашаго прызыву у „Блёк". На прапанаванае праз Беларускі выбарны камітэт у Вільні сабраньне Віленскіх расейцаў зьявілася усяго 17 асоб, а рэшта выдала адозву ў газэце „Вілен. Утро", гдзе ганіла нашую беларускую справу і заявіла, што з намі ня пойдзе. І ўзапраўды многа іх пайшло галасаваць з„Вызваленьням" з „Пястам" з „Зялёным Дубам" і іншымі партыямі, а ня з намі. Яны тагды не чакалі, які пасьпех можа мець „Блёк меншасьцяў".

Цяпер, гледзячы на гэты папярэдні прыклад і ведаючы, якую сілу можа мець „Блёк" і на гэтых выбарах яны-б хацелі ўвайсьці ў яго, але хацелі-б каб мы іх „прасілі" аб гэтым, бо „гонар" іхны перашкаджае ім прызнаць сілу і значэньне беларускага ці ўкраінскага народу, з якімі пававадыром РНО хацелася-б ісьці нават ня поплеч, як роўны з роўным, а кіраваць і верхаводзіць.

Праўда і тое што ня ўсе РНОўцы такія. І сярод іх ёсьць людзі досіць прыхільна адносячыяся да беларусаў і беларускай справы, але-ж увайшлі у РНО і ўсе тыя хто адносіцца да нас па папярэдняму.

Мы гэта павінны добра ведаць і памятаваць, бо калі чуем іхныя прамовы і чытаем іхныя адозвы зварочаныя да беларускага народу з рознымі абяцанкамі і змялі, і свабоды царквы і сваей школы і г. д., то трэба помніць што толькі невялічкі і дужа невялічкі склад „РНО-ўцаў" шчыра жадае гэтага.

Не дарма-ж гэтыя лозунгі з'явіліся толькі перад выбарамі толькі цяпер, а што будзе пасьля?

У ўспомненнай стацьці мы ўжо паказывалі розьніцу і ў поглядах і ў тактыцы паміж намі і павадырамі РНО і ў адносінах да ўраду, і ў пытаньні царкоўным, і пытаньні зямельным.

Калі да ўраду мы стаялі ў аппазыцыі, яны ламалі фронт і „расшарківаліся“ ў сваей лёяльнасьці і прыхільнасьці, калі мы стаялі за свабоду царквы, — іхныя павадыры ішлі шукаць „контакту“ з афіцыяльнай царкоўнай ўладай, якая якраз зьнішчыла гэтую свабоду. Цяпер яны ўжо крычаць і аб зямлі, абяцаючы яе працоўнаму народу, а ў склад кандыдатаў у Сойм і Сэнат наставілі ўсюды абшарнікаў, ад якіх трудна дачакацца, каб яны шчыра выпаўнялі гэтыя абяцанкі.

Вось за што мы ні крыху ня ганячы а ні „русскіх“ наагул, а ні іх права на самаакрэсьленьне і нацыянальную свабоду, папераджаем сваіх Беларусаў, а нават і „русскіх“ **асьцярожнымі быць з гэтымі ўсімі абяцанкамі „на час выбараў“ і галасаваць толькі за „Блёк“ (№ 18)**, які адзін ёсьць узапраўдным прадстаўніком імкненьняў усіх меншасьцяў... нават і „русскай“, насколькі гэта ёсьць частка рускага народу, а не абломкі вядомага рэжыму і вядомых „сфераў“.

СЯБРА.

„Урадовец“ які „робіць“ выбары. *)

Выбары паслоў у Сойм і сэнатараў у Сэнат маюць быць выразам няпрымушанай волі народу, які ў рэспубліцы ёсьць найвышэйшым кіраўніком сваіх лёсаў — суверенам, вышэйшым за ўсіх найвышэйшых урадоўцаў-саноўнікаў.

Артык. 2 Польскай Канстытуцыі пачынаецца славэмі:

„Вярхоўная ўлада ў Польскай Рэспубліцы належыць да народу“.

Народ творыць свае выканаўчыя органы — адміністрацыю і ўрад.

Урадоўцы ўтрымліваюцца з пэнсыяў, на якія народ плаціць падаткі — пасрэднія і безпасрэднія.

Кожны з урадоўцаў мае сьцісла азначаныя ў законе абавязкі, якія павінен спаўняць.

Але сярод гэтых прадпісаньняў закону няма ані воднага, якоя-б загадывала ці дазваляла — міністру, ваяводзе, ці старасьце, паліцыянту, ці судзьдзі выкарыстоўваць свае ўрадавае становішча і ўладу ў мэтах уплываньня на тое, каб выбаршчыкі галасавалі так, як хоча ўрад...

Стараста, склікаючы войтаў, каб дагучыць ім падтрыманьне ўрадавага кандыдата, чыніць праступленьне, — надужыцьце ўлады.

Паліцэйскі, агітуючы службова за ўрадавым кандыдатам, чыніць так-жа праступленьне.

Ваявода, абяцаючы, на моцы сваей улады, розныя карысьці, ці пагражаючы шкодамі выбаршчыкам, націскаючы іх тым галасаваць за ўрадавага кандыдата, таксама ёсьць праступнікам.

У праваым гаспадарстве ніякі ўрадовец не павінен наагул службова высоўваць таго ці іншага кандыдата, як урадовага, а таксама ганіць публічна іншых кандыдатаў, бо гэта ўсё ёсьць надужыцьце ўлады.

Недарма-ж угалоўны кодэкс карае гэтыя праступленьне, бо ўрадовец, „ро-

*) Гэтая стацьця есьць пераклад з польскага, стацьці п. Дашынскага, рэдактара пэпээсаўскай газэты „Пабудка“. Стацьця зьмяшчаецца у нас с прычыны яе вялікай актуальнасьці і трафнасьці, — у перакладзе, зробленым газэтай „Беларускай Крыніцай“ (№ 7). Стацьця троху скарочана проці арыгінала.

бячы выбары", перастае быць урадоўцам, але робіцца ўжо „партыйнікам", які аднак-жа бярэ пэнсію з касы дзяржаўнага скарбу.

Такі ўрадовец робіцца ціхім супольнікам розных людзей, якія часта робяць брудныя інтарэсы пры выбарах.

Такая адміністрацыя траціць даверые ў грамадзянства і сама робіцца партыйнай. Пасьля такіх выбараў няма ўжо мовы аб павазе ўрадоўца, які на моцы свайго ўрадавага становішча займаўся агітацыяй, падтрымліваючы адных, зьбіваючы другіх кандыдатаў.

Маладое польскае чыноўніцтва, затручанае выбарнай агітацыяй, можа ператварыцца ў нейкую ракавую пухліну, якая сточыць дый зьесьць праўны арганізм дзяржавы...

Калі такі ўрадовец будзе падтрымліваць, напрыклад, паляка проці украінца, (ці беларуса. Рэд.), тады слушна могуць лічыць яго за *„польскага"* урадоўца, але не безстароннага, і слушна ня будуць мець даверыя да такой адміністрацыі.

Калі ўрадовец „робіць выбары" — па загаду згары, тады ён перастае быць чэсным чалавекам,—бо-ж яму заўтра іншы міністар загадае ды змусіць яго-ж— зьбіваць тых, якіх ён падтрымлівае сяньня.

Толькі недасьпелыя палітычна тасуюць пры выбарах яўны выбарны подкуп шляхам надужыцьця ўрадоўцамі ўлады. Толькі ў народаў, нізка стаячых, урадоўцы па загаду згары „выбіраюць" законадаўчыя палаты, залежныя ад ураду...

Дык, ведама-ж у гэтых народаў ніхто ня верыць у чэснасьць урадоўцаў.

Там — „łapówka", пратэкцыя, надужыцьце ўлады —сталыя зьявішчы ў ва урадавых установах.

Калі ўрадовец купляе галасы, засноўвае і фінансуе выбарныя газэты, плаціць раз'ездным агітатарам, перакуплівае павадыроў праціўных партыяў, — дый робіць гэта ўсё за грошы, атрыманыя „зьверху", тады ён дае масам прыклад найгоршага роду грамадзянскага сапсуцьця, дый варты ёсьць за гэта вастрогу.

Разумныя людзі, чэсныя грамадзяне ня патрабуюць у часе выбараў урадавых „падсказаў" дый нагул знаць ня хочуць ніякіх „урадавых кандыдатураў".

Такі „урадавы кандыдат" сярод палітычна разьвітых грамадзян адразу траціць ўсялякія шансы пасьпеху, якраз дзякуючы гэтай азнацы: „жондовы"... Бо-ж ясна, што для выбраньня яго паслом трэба грошаў ды надужыцьцяў улады... Ужо праз гэта адно ён робіцца падазроным.

Як нявольна ў часе выбараў карыстацца касьцельнай амбонай, ці спавядніцай, як нявольна купляць галасы за грошы багачоў, як нявольна кіям, палкай, гарэлкай, пагрозай ўплываць на выбаршчыкаў, акурат таксама нявольна „абрабляць" іх — шляхам „урадовай намовы".

Што-б сказалі, калі-б — у самадзяржаўнай манархіі, дзе сувэрэнам ёсьць цар, міністар сьпярша напаіваў-бы цара, а пасьля даваў-бы яму для падпісу праекты законаў?

Што зрабіла Расея, калі даведалася аб тым, што праступны ашуканец Распуцін шкадліва і стала ўплывае на цара і царыцу? Расея забіла сьпярша Распуціна, а пасьля цара і царыцу.

Што-ж можа зрабіць рэспублік , дзе самадзержцам, як сказана, ёсьць народ, калі яе ўрадоўцы ў часе выбарнай дзейнасьці міліёнаў грамадзян, чыняць масава праступленьне, надужыцьця ўрадавай улады.

— Патрэбаваць суровай кары для праступнікаў, а калі яны дзеялі па загаду зьверху, тады аддаць міністра пад суд.

Але, калі гэтыя выбарныя „ўплывы" астаюцца бяскарнымі, тады народ страшэнна церпіць з прычыны дрэннай, здэмаралізаванай адміністрацыі дый з прычыны сфальшаваньня выбараў у заканадаўчыя палаты, якія па загаду ўраду будуць прымаць яго законы, страціўшы поруч з урадам усялякае даверые вялікай большасьці народу.

Дык той, хто неасьцярожна дагаджае ўраду рабіць націск у часе выбараў праз урадоўцаў, той або ёсьць цёмны чалавек, не разумеючы ў гэтых рэчаў, або хочаісьці да ўлады шляхам праступленьня.

Але ён дачакаецца толькі найгоршых для рэспублікі пасьледзтваў, бо-ж раз страчанага даверыя да ўрадоўцаў доўга-доўга ня можна будзе адбудаваць...

——*O*——

10 гадоў таму назад.

(З успамінаў аб працы Маскоўскага Сабору ў часе бальшавіцкага перавароту)

(працяг).

На другі дзень (у нядзелю 31 студня) назначана было ўрачыстае богаслужэньне ў крэмлёўскім Успенскім саборы. Усіх богамольцаў бальшавіцкая улада ў Крэмль ня пусьціла; дазволена было прысутнічаць на багаслужэньні толькі духавенству, сябрам Сабора і яшчэ невялікай колькасьці багамольцаў па асобным пропускам, выданым бальшавікамі. Помню раньніцу, калі мы, сябры Сабору, доўга стаялі каля крэмлеўскай брамы, пакуль нарэшце прыйшоў з камендатуры Крэмля нейкі бальшявіцкі ўраднік у вайсковай вопратцы з заспаным тварам, з яўнымі сьлядамі ніто алькаголю, ніто какаіну і стаў прапускаць у браму, праверачы прапускныя білеты.

А´едню служыў патрыарх і многа архіерэяў і ніжэйшага духавенства. Сьпяваў мітрапалічы хор. Усе шчыра маліліся. Пасколькі помню, казаньне ў царкве гаварыў ацец Георгі Спаскі, вядомы віленскім праваслаўным жыхарам яшчэ перад вайной сваім краснамоўствам *). Пасьля абедні з сабора тронулася працэсія на „Чырвоны Пляц" праз Спасскую браму.

У Крэмлі было зусім пуста, бо, як я сказаў, бальшавіцкая улада народу ў Крэмль ня дапусьціла. З Крэмля нам ня відаць было, ці ёсьць народ, на пляцу, ці не.

Я ішоў у працэсіі разам з сябрамі сабору ад Віленшчыны. З заміраньнем сэрца зближаліся мы да Спасскай брамы. Што там будзе? Ці прыйшоў народ, каб бараніць сваю праваслаўную Царкву, ці не? А, што калі не? А што, як разам з палітычным пераваротам ён страціў і веру, паддаўшыся прапагандзе і агітацыі камуністаў? А што, як у знак згоды з бальшавіцкай уладай, ці, наймене́й, проста „страха радзі", ён ня прыдзе сяньня на „Красную плошчадзь"? З такімі думкамі падыходзілі мы да Спасскай брамы, і з вышыні яе нам будзе відаць увесь „Чырвоны пляць" як на далоні...

Ледзьве мы выйшлі з брамы, як нам прадставілася зусім нявіданнае зрэлішча. Увесь вялізарны „Чырвоны пляц" быў бітком набіты народам так, што, здавалася, ня можна-б было гдзе, як гаворыцца „яблыку ўпасьць". І ня толькі пляц, але ўсе вуліцы, які прылягаюць да пляца, як толькі можна было ахапіць вокам,—усё было пакрыта нязлічанымт натоўпамі праваслаўнага народу, які прышоў сюды, каб паказаць сваю прыхільнасьць і вернасьць веры і Царкве. Над гэтым бязмежным морам людзкіх галоў блішчэла на яркім зімнім сонцы мноства харугвяў, крыжоў, абразоў, што рабіла агульны від усяго гэтага відовішча захопліваюча—пекным.

Такая маса народу сабраўшагася ў адно мейсца дзеля аднэй ідэі, дзеля думкі, адразу падняло агульны настрой, падняло дух на высату, якая найлепш гарманавала з прыгажэйшым выглядам...

І вось тут здарыўся адзін ня вялічкі выпадак, ці, як гавораць, інцыдэнт, які з пачатку паказаўся для мяне дужа дзіўным пры такім агульным настроі народа, але пасьля, калі я аб ім падумаў, ён мне стаў ня толькі зразумелым, але і навучыў глядзець на многія рэчы іначай.

У Крэмлі, каля варот і на пляцу,—усюды былі раськінуты невялічкія пікеты краснаармейцаў, чалавека па тры, па чатыры, якія зорка сьлядзілі за ўсім, што робіцца, але працэсыі ня перашкаджалі. Ня ведаю якім спосабам у Крэмль папаў і цяпер ішоў у працэсіі стары з даўгой белай барадой расейскі генэрал у шэрай шынэлі з залатымі пагонамі. Бальшавікі даўно ўжо заба-

*) Цяпэр ен знаходзіцца у Парыжу і, як у Вільні, захоплівае слухачоу сваімі надзвычай пекнымі і гарачымі царкоунымі казаньнямі.

ранілі афіцэрам і генэралам насіць пагоны. Калі хто з іх выходзіў на вуліцу ў пагонах, дык у лепшым выпадку ў яго пагоны зрывалі, а то арэштовывалі і садзілі ў турму. Дзеля гэтага афіцэры хадзілі па вуліцы ліба ў цывільнай адзежы, ліба ў вайсковай, толькі бяз пагонаў. Але відаць на гэты раз стары генэрал рашыўся выйсьці ў пагонах, бо відаць, трудна было яму, увесь свой даўгі век праслужыўшаму ў войску, можа быць нават многа разоў раненаму, адмовіцца ад жаданьня яшчэ раз убачыць сябе ў залатых пагонах, якія зьяўляюцца прызнакам афіцэрскага ці генэральскага чыну. Ён мусіць думаў, што сярод вялізарных натоўпаў рэлігійнага народу, бальшавікі ня адважуцца яго зачапіць...

Калі мы былі ўжо каля Спасскай брамы, раптам, два ці тры краснаармейцы, шпарка аддзяліўшыся ад сьцяны, гдзе яны стаялі прыціснутыя натоўпам народа, заўважыўшы генэрала, сьмела дзьвінуліся ў самую гушчу, растаўхалі народ і зблізіліся да генэрала:

— Эй! генэрал! Вы што-што-ж гэта ў пагонах?" Яны падхапілі беднага старыка пад рукі і павялі вон з таўпы...

Што будзе? Пад уплывам учарашняга ўражаньня я думаў, што вось зараз, як і ўчора, з усіх бакоў пацягнуцца да гэтых краснаармейцаў рукі, і яны так сама згінуць сярод таўпы, як учарашні ругацель. Але... ня толькі ня здарылася гэтага, але нават сярод таўпы пачуліся зусім процілеглыя выкрыкі і сэнтэнцыі: — „Так і слѣдует! Чего вышел-то с погонамі? Знаешь распоряженіе? Ну і надо поцчиняться!".

З пачатку, паўтараю, я адразу ня ўразумеў, чаму гэта рэлігійна настроены народ так холадна аднесся да беднага старыка — генерала. Але пасьля зразумеў, што калі і праўда тое, што народ тут мала выявіў жаласьці і міласэрдзія, дык *прынцыпова* безумоўна ён меў рацыю. Ён выйшаў сюды на гэты пляц, каб бараніць *веру*, а ня генэральскія *пагоны*. Гэта толькі дзякуючы прывычцы, якая так укаранілася ў нас з дзяцінства, ад прысутнасьці на розных урачыстых богаслужэньнях, нам стала трудна аддзяліць сьвецкі, дзяржаўны дадатак да богаслужэньня ад чыста церкоўнага, так што погоны і ўсякі блеск стаў здавацца нам ледзьве не неабходнай прыналежнасьцю царквы і багаслужэньня. А народ глыбей зразумеў сутнасьць справы. Вось учора ён ледзь не разарваў чалавека, які асьмеліўся зьняважыць царкву, а сяньня... генэрал (хоць мне і дужа жалка беднага старыка) безумоўна ня меў рацыі, бо *хацеў свае пагоны паставіць пад абарону Царквы*, ці іначай: *скарыстаць Царкву для мэтаў нічога супольнага з царквой і рэлігіяй ня маючых.*

На „Краснай плошчадзі", на „лобным мейсцу", на вазвышэньні, гдзе калісьці асуджывалі і казьнілі праступнікаў, быў адслужаны малебен. Ня памятую хто гаварыў казаньне. А пасьля ўсе сабраўшыяся крэсныя ходы сталі паціху разыходзіцца ў розныя бакі па вуліцам, прылягаючым да „Чырвонага пляцу".

Настрой быў ува ўсіх паднесяны: Ня ведаю, хто першы сярод крэснага ходу зацягнуў пасхальную песьню. „Хрыстос Васкрэсе"! Яе падхапіў другі крэсны ход, трэці і гэт. далей. Так і разыйшліся працэсіі па ўсей Маскве, абвешчываючы ўсіх аб вялікай маральнай перамозе веры над няверуючымі цёмнымі сіламі...

Гэты крэсны ход ясна выявіў дзьве рэчы. Першае — што народ праваслаўны ў падаўляючай сваей большасьці крэпка трымаецца веры праваслаўнай, як падставы свайго жыцьця,— што ён не адрачэцца ад яе ні пры якіх варунках і будзе змагацца за яе пры ўсялякай уладзе, усялякіх палітычных абставінах і ўстроях. І другое, — што народ зусім ня зьмешывае палітычнага строю з царквой і рэлігіяй. Дзяржава ня ёсьць штось вечнае пастаяннае, тым больш— ня вечны яе ўрад. Сяньня — адзін, заўтра — іншы. Сяньня манархія, заўтра — рэспубліка, сяньня адны парадкі, заўра іншыя. А вера хрысьціянская павінна быць нязьменная. Папярэдняя ўлада неправідлова зьмяшала пэўны (манархістычны) строй з рэлігіяй. Народ паказаў, што бяз гэтага строю (генэральскія пагоны) ён абыйсьціся можа, а бяз веры і бяз Царквы — ніколі.

(Аканьчэньне будзе).

В. Багдановіч.

Беларуская выбарная справа.

У першых днях гэтага лютага Блёк Нацыянальных Меншасьцяў злажыў па ўсіх вакругох свае сьціскі. Гэтым закончыўся другі пэрыяд выбарнай кампаніі, бо 3-га лютага ўжо мінуў тэрмін падачы сьпіскаў.

Улажэньне сьпіскаў кандыдатаў Беларускага Аб'яднанага Выбарнага Камітэту папярэдзілі зьезды і канфэрэнцыі выбаршчыкаў у паасобных вакругох. Такія зьезды і канфэрэнцыі адбыліся: у Баранавічах 22-га студзеня, у Ваўкавыску 24-га студзеня, у Сьвянцянах 23 студзеня, у Маладэчне 26 га студзеня, у Горадні 26-га студзеня г. г. і інш.

На зьездах былі выстаўлены паасобныя кандыдаты на сьпіскі Блёку Нац. Меншасьцяў, а на паседжаньні Беларускага Цэнтральнага Аб'яднанага Выбарнага Камітэту, якое адбылося 27 і 28 студзеня, былі аканчальна зацьверджаны сьпіскі кандыдатаў на пасолў у Сойм і Сэнат ад Беларусаў.

Ува ўсіх 9 вакругох Беларускі Аб'яднаны Выбарны Камітэт Блёку Нацыянальных меншасьцяў падаў сваіх кандыдатаў на сьпісках Блёку Нацыянальных меншасьцяў.

Першыя кандыдаты ў Сойм на сьпісках па вакругох наступныя:

I. Сьвянцянскі вокруг.

1) Каруза П., 2) Стэповіч А., 3) Юхневіч К., 4) Конон, 5) Чэрніхаў і інш.

II. Лідзкі вокруг.

1) Більдзюкевіч А., 2) Пазьняк Я., 3) Чэрніхаў, 4) Яковіч Я. і інш.

III. Наваградзкі вокруг.

1) Рагуля Б., 2) Куніцкі Ів., 3) Яковіч Я., на чацьвертым месцы кандыдатуе Жыд, 5) Голад Л.

IV. Вільня і Віленска-Троцкі павет.

1) Д р Выгодзкі, 2) Грабінскі Б.

V. Беластоцкі вокруг.

Першае месца жыдоўскае, далей ідуць беларускія кандыдаты: 2) Д-р Туронак Б., 3) Грыпевіч, 4) Наруш і інш.

VI. Горадзенскі вокруг.

1) Федарук Уладз., 2) Жыд, 3) Зянюк Карп.

VII. Бельскі вокруг.

1) Белы, 2) Голад Л., 3) Сергяюк.

VIII. Берасьцейскі вокруг.

1) Арцямюк, 2) Пазьняк А., 3) Куроўскі Г., 4) Салавей.

IX. Пінскі вокруг.

1) Астроўскі, 2) Куніцкі, 3) Чэрніхаў.

На дзяржаўным сьпіску ад Беларусаў кандыдатуюць: Ярэміч Ф., Васілеўскі Ів. і Яцына А.

Кандыдаты ў Сэнат:

Віленскае ваяводзтва.

1) Багдановіч Вячаслаў, 2) Д-р Шабад, 3) Сухадолец, 4) Тарчэўскі і 5) Беганскі А.

Наваградзкае ваяводзтва.

1) Рагуля Б., 2) Багдановіч С.—са Сланіма, 3) жыдоўскі кандыдат, 4) Сухацолец.

Палескае ваяводзтва.

Ад Беларусаў: Зянюк Карп і Макарэвіч П.

Беластоцкае ваяводзтва.

1) Рубінштэйн, 2) Багдановіч Вяч., 3) Зянюк Карп, 4) Аарпюк Т.

На дзяржаўным сьпіску ў Сэнат кандыдатуюць ад Беларусаў: Беганскі Антон і Багдановіч В.

Як мы ўжо ведаем на „панствовай лісьце“ **беларусы стаьць толькі па № 18. Іншых дзяржаўных беларускіх сьпіскаў няма,** бо нявялічкія беларускія групы, стварыўшыяся з былой „Грамады“, якая цяпер разьбілася аж на

пяць групаў, а таксама нібы беларускія угадоўскія партыі, — ні адна ня здолела падаць дзяржаўнага сьпіску.

Замест гэтага па некатарых вакругох гэтыя групкі падалі свае сьпіскі **акружныя** над рознымі нумарамі.

З гэтых сьпіскаў можна адзначыць гэтакія: 1) Штучна створаная польскай эндэцыяй група **Паўлюкевіча**, які пападаў свой сьпісак пад назовам „агульна-беларускага народнага сьпіску". Аб партыі Паўлюкевіча мы ніколі яшчэ ня пісалі ў сваей „Праваслаўнай Беларусі" нічога. Аднак аб ім так многа пісана ў іншых беларускіх часопісах, што асоаба яго з боку палітычнага досыць ведама ўсім. Думаем, што галасаваць за яго сьпісак будуць толькі тыя, хто безпасрэдна ад яго атрымлівае грошы і хто зьяўляецца платным „ужэнднікам" у яго арганізацыі: у Вільні ён утрымлівае „ігорны дом" пад назовам „Беларуская хатка". 2) Другая ўгадоўская группа **Умястоўскага** нават страціла ўжо і імя беларускае. Умястоўскі ў сваім „Беларускім Дні" доўга пісаў у гаспадарчым аддзеле аб тым, „як выбіраць добрага каня". Відаць добра сам сябе навучыў, бо выбраў нарэшце сабе „добрага каня" — у польскай партыі „спулпрацы з жондам". Паедзе далёка! 3) За гэтымі дзеячамі пайшоў „беларускі спадар" **Янка Станкевіч**. Розьніца толькі ў тым, што яго падтрымліваюць не „эн-дэкі" і ня „споўпраца", а іншыя польскія палітычныя групы „польскіх дэмакратаў", згуртаваўшыхся каля польскай газэты „Kurjer Wileński". Відаць, што для нейкай прыкрасы, каб ня адразу можна была распазнаць узапраўдны характар яго групы, ён на свой сьпісак паставіў жонку вядомага беларускага дзеяча паню Астроўскую. 4) Частка былой „Грамады", так сказаць грамадоўская правіца, згуртавалася каля сэнатара **Уласова**. Гэты беларускі дзеяч сам сябе любіў называць „беларускім кадэтам" (на манер расейскіх ка-дэтаў: Ка-Дэ, — канстытуцыйна-дэмакратычная партыя). За час свайго сэнатарства Уласаў займаўся не палітычнымі справамі, а насаджываньнем сярод Беларусаў „мэтодызму" (амэрыканская рэлігійная сэкта), пераважна ў сваей Радашкаўскай гімназіі. Як так здарылася, што гэта „ка-дэцкая галава" уселася на „грамадоўскае тулава", трудна зразумець. Гэта ненармальнасьць скора і выявілася. Палітычныя крокі, зробленыя п. Уласовым у ўрадавых кругох у Варшаве, так узбурылі тулава проці галавы, што Уласаў змушаны быў урачыста адмовіцца зусім ад палітычнай працы, аб чым ён і заявіў у пісьмах у прэсу (гл. у польскам „Słowie" і ў паўлюкевічаўскім „Беларускім Слове"). Ня гледзючы аднак на гэтае ад рачэньне ён усё-ж выставіў свой сьпісак пад назовом „сьпіска беларускага працоўнага народу".

Аб іншых беларускіх ці поўбеларускіх сьпісках ня варта і ўспамінаць. Гэтыя сьпіскі ня маючы свайго аднаго дзяржаўнага нумару змушаны ў кожным вокрузе складаць асобныя розныя нумары, дзеля чаго выходзіць вялікая путаніца, разьбіваючая толькі галасы і псуючая беларускую выбарную справу. Дзеля гэтага кожны беларускі выбаршчык павінен добра помніць, што **ўзапраўдны беларускі сьпісак, адзіны па ўсіх вакругох ёсьць сьпісак № 18 і галасаваць толькі за яго, каб ня псаваць справу выбараў і ня шкодзіць беларускаму народу.**

СЯБРА.

Новадворская Царква.

(Пісьмо да Рэдакцыі).

Ужо больш як шэсьць гадоў таму назад адабралі ад нас нашую праваслаўную царкву. Адабралі яе ў самы прыкры спосаб. Як можа Вы ведаеце, бо аб гэтым гаварылі нашыя паслы ў Сойме і Сэнаце, у самае сьвята нараджэньня Божай Маці ў царкву ўварваўся мяйсцовы паліцыянт Аляксандар Бацькоўскі ў шапцы і з карабінам ды і голасна патрэбаваў спыніць адправу багаслужэньня і ўсім выйсьці з царквы, бо ён павінен яе зачыніць. Ня гледзячы на ўсе просьбы верных парахвіян, царква была зачынена, а мяйсцовы ксёндз па-

чаў яе разбурываць. Усе нашыя прозьбы да мяйсцовай улады і ў міністэрства аставаліся без усялякага рэзультата. Як толькі сабраўся першы Сойм з нашымі прадстаўнікамі, мы зьвярнуліся да нашых паслоў. Яны дабіліся таго, што Сойм зьвярнуў увагу на нашае гора. Выяжджала да нас Соймавая Камісія з п. Тугутам на чале і з панам Ярэмічам паслом з Беларускага Клюбу, якая аглядала царкву, прызнала гвалт, які ўчынілі над намі, і пастанавіла, каб царкву нам зьвярнуць і адбудаваць яе на скарбовы кошт, але на жаль... ключы ад царквы п. Тугут аддаў ня нам, а старосьце. Ад гэтага толькі тады мы сваю царкву і бачылі!

Вось ужо шасьць гадоў бяз перарыву мы ходзім, просім, абіваем усім парогі, пачынаючы ад нашага бурмістра і паліцыянтаў і канчаючы мітрапалітам, міністэрствам, Соймам і Сэнатам і... усё нічога! Мала таго, мяйсцовы ксендз, бачучы, што царкву ня адбудовываюць ізноў пачаў яе разбурываць: зьняў галоўны купал, разбурыў іканастас! Мы зразумець ня можам, за што гэта нас у царкву, каб пачыніць яе, прывесьці да парадку, ня пушчаюць,—ключоў няма, а для таго, хто яе разбурывае,— ёсьць! Ізноў мы ездзілі, ізноў прасілі. Разбурэньне затрымалі, але што з таго, бо цяпер ужо яна і сама разбурываецца, бо праз разабраны купал, праз разьбітыя вокны ідзе дождж, сыпіцца сьнег. Прасілі мы, каб нам дазволілі падабраць і злажыць у царкву хоць матэрьял ад разбуранага купала, І гэтага няможна! Матэрьялы патроху расьцягнулі наапал суседніх дамоў.

Мы ўжо даўно ўтрацілі ўсялякую надзею, што нам адбудуе царкву Ўрад згодна з пастановай Соймавай Камісіі. Мы ўжо даўно просім, каб нам гэта было-б дазволена стварыць на свой уласны кошт, але і гэтага ня дазваляюць. Атрымалі толькі дазвол ад свайго архіерэя, але гэтага мала, — з такім дазволам, аднэй толькі духоўнай улады, рэмонт рабіць ня можна. Прасілі Горадзенскую Кансысторыю, і яна сама зьвярнулася да ваяводства з гэтай прозьбай яшчэ у кастрычніку мінулага году, але да гэтага часу аніякага адказу ад ваяводства нама. А тым часам царква патроху бурыцца і бурыцца...

Парафія нашая мае больш 1800 праваслаўных верных раскіданых па некалькіх вёсках. Цяпер бліжэйшая да нас царква ў Ячнаве, — гэта восем вёрст ад нашага Новага Двара, а ёсьць вёскі якім яшчэ да нас дзесяць вёрст, і праз Новы-Двор ехаць, г. ё. восемнадцаць вёрст ад бліжэйшай царквы! Хто можа пайсьці і паехаць гэтак далёка? Яшчэ добра даросламу, а як жа быць з малымі дзяцьмі? Як жа іх павясьці да споведзі ці да прычасьцьця? Ці могуць яны вытрымаць такую дарогу нашча? А што рабіць у зімовую пару? — у распуціцу вясной? І вось старыкі яшчэ так сяк па старым абычаям цягнуцца, а моладзь зусім адбілася ад царквы: у сьвята — карты, пьянства, гульба. Зусім трацяцца ўсялякія рэлігійныя і маральныя падставы жыцьця! Ды й што гаварыць пра моладзь, калі і мы старыкі столькі хадзіўшы, столькі прасіўшы і маліўшы, адбіўшы ўсе парогі пачынаем траціць усякую веру і ў Бога, і людзей і наагул ўва ўсялякую справядлівасьць на зямлі, бо ніяк ня можам зразумець, таго каму мы (праваслаўныя) перашкаджалі-б тым, што маліліся-б у сваей царкве? Аж вось перашкаджаем, відаць яшчэ камусь, бо адзін пастыр (каталіцкі) разбурывае царкву, хоць у яго тут-жа ў Новым-Дворы стаіць вялізарны касьцёл, а другі карыстае на гэтым, бо павялічываецца яго прыход, а з ім і даходы, а наш архіпастыр згадзіўся на рэдукцыю нашае парахвіі і асобнага сьвяшчэніка нам ня дае. Дык ці Хрысту, ці яшчэ каму служаць нашы пастыры? Ці можа нашыя малітвы перашкаджаюць ураду? Але-ж, здаецца, мы жывем ня ў С. С. С. Р., гдзе барацьба з рэлігіяй уважаецца абавязкам кожнага камуніста? Вось каму, дык можа што і патрэбна гэта, бо на грунце гэтага адрыва ад царквы і рэлігіі хутка вырастаюць адпаведныя настроі сярод насяленьня.

Пане рэдактар. З горам і сумам пішу гэта вам. Зьмясьціце ў сваей часопісі, а можа хто і пачуе нашыя енкі і прыдзе нам на помач, бо ў нас ужо трацяцца астатнія надзеі і астатняе цярпеньне.

Ян Гаротны.

ЦАРКОЎНАЯ ХРОНІКА.

Сінод праваслаўнай (ціханаўскай) царквы у С. С. С. Р.

У Маскве апублікованы тэкст афіцыяльнага прызнаньня савецкай уладай сінода патрыаршай праваслаўнай царквы, утворанага замясьціцелям местаблюсьціцеля патрыаршага прэстола мітр. Сергіям. Гэты дакумэнт выданы адміністрацыйным аддзелам „Наркомвудела" (народн. камісарыят унутр. спраў) ад 20 мая 1927 г. за № 22-4503-62. Зьмест гэтага дакумэнта такі: „Заява выпаўняючага абавязкі местаблюсьціцеля маскоўскага патрыарха мітрап. ніжэгародскага Сергія, грамадз. Старагародскага (фамілія Сергія) і сьпісак арганізаванага пры ім так званага „патрыаршага Сінода" ў складзе: 1) мітрап. наўгародскага Арсенія *) 2) мітрапаліта Серафіма Цьвярскога (Александрова), 3) архіеп. Валагодзкага (ў газэтах імя яго не пададзена), 4) архіеп. зьвенігародскага Філіпа (Гумілеўскага), 5) архіеп. кастрамскога Севасьцьяна (Веста) і 6) яп. сумскага Канстантына (Дьякава) у адміністрацыйным аддзеле Г. П. У. Н. К. В. Д. (Галоўнае палітычнае ўпраўленьне народнага камісарыяту ўнутраньніх спраў) палучана да ведама. Перашкод да дзеяльнасьці органа аж да яго сьцьверджаньня няма". Подпісы, пячаці.

*) Былы віцэ-прэзэс Вялікага Маскоўскага Сабору і кандыдат на патрыарха.

Гэты дакумэнт з'яўляецца рэзультатам вядомага мэморыялу, паданага мітр. Сергіям да бальшавіцкай улады і яго „обращенія" (адозвы) да духавенства, якое ў свой час так нашумела пераважна ў эмігрантскіх расейскіх кругох. Гэтым дакумэнтам і праваслаўная патрыаршая царква нарэшце стала ў С. С. С. Р. у „прававое палажэнія", пастолькі, паскольки можна гаварыць аб правох у гэтай нібы рэспубліцэ.

Дасюль правамі карысталіся там толькі „абнаўленцы" і „жывацаркоўнікі".

Юбілей мітр. Еўлогія. Заходняэўрапэйская праваслаўная епархія ўрачыста адсьвяткавала 12→25 гэтага студня 25 гадбвы юбілей яго епіскопства. Расейскія і іншыя загранічныя газэты дужа цёпла прывіталі ўладыку, адзначаючы яго вельмі пладавітую дзеяльнасьць на карысьць праваслаўя. Найгалайнейшай яго справай з'яўляецца утвареньне ў Парыжу „Сергіевскага падворра" і ў ім Багаслоўскага інстытуту ў які Уладыка змог прыцягнуць да працы найвіднейшых прадстаўнікоў праваслаўнага багасловія.

„Сергіеўскія лісткі". Пры „Сергіеўскім падворры" у Парыжу пачалі выдавацца рэлігійна-маральнага зьместу лісткі. Выйшаў ужо 3-ці нумар. Пробныя нумары ліскоў можна выпісаць ад Рэдакцыі „Праваслаўнай Беларусі".

Палітычная хроніка.

— **Польска-літоўскі канфлікт**, абвастрыўшыся ў канцы мінулага гэтага года ледзьве не да вайны паміж Літвой і Польшчай, яшчэ аканчальна ня зьліквідаваны. Ліга Нацыяў, на разважаньне якой аддадзена была справа ўрадамі абедзьвюх дзяржаваў, была ў сілах толькі перашкодзіць узрыву вайны і змусіць абодвы ўрады да эгоды на перагаворы. Але пакуль-што гэтыя перагаворы яшчэ ня пачаліся, а прыватныя размовы абедзьвюх дзяржаваў паказываюць, што прычыны канфлікту ня толькі ня зьліквідаваны, але і ня скора зьліквідуецца.

Пакуль-што абедзьве дзяржавы абмяняліся афіцыяльнымі „нотамі" (заявамі).

Міністар вонкавых спраў Польшчы

п. Залескі ў сваей ноце прапануе вясьці перягаворы ў Рызе, пры чым сам гатоў стаць на чале польскай дэлегацыі. У праграме перагавораў ён ставе чатыры пункты: 1) аб граніцах, 2) аб паштова-тэлеграфным, 3) аб чугункавам і 4) аб транзітным (таваровым) руху.

Літоўтлі міністар Вальдемарас у адказнай ноце адзначае, што праграма польскага міністэрства не распрацавана, у сувязі с чым ён уважае, што перагаворы вясьці яшчэ ня можна, што гэты срок перагавораў можна акрэсьліць толькі ў Лізе Нацыяў, што п. Залесскі ня добра зразумеў рэзалюцыю Лігі Нацыяў, якая выключыла Віленшчыну з праграмы перагавораў, што Польшча ня ўтрымала свайго слова, што да неўмешацельства ў-ва ўнутранія справы Літвы, што Літва ўперад за ўсё трэбуе адшкадаваньняў за ўбыткі, створаныя аккупацыяй Віленшчыны праз ген. Жэлігоўскага і г. д.

Адным словам, з гэтага ясна, што цэнтрам усей справы паміж Польшчай і Літвой з'яўляецца Віленшчына. Літва яўна згадзілася-б на ўзнавеньне нармальных паштовых, чугункавых і іншых адносін з Польшчай, але... апрача Віленшчыны, бо яна разумее, што кожнае яе пісьмо, ці пасылка, перасланая ў Віленшчыну як у польскі край з'яўляецца ў нейкім сэнсе прызнаньнем Віленшчыны за Польшчай, — што кожны пасажыр переехаўшы граніцу паміж Ковеншчыняй і Віленшчыняй, як праз граніцу дзьвёх дзяржаваў, ужо з'яўляецця нейкім доказам згоды (хоць-бы і часовай згоды) Літвы на ўзнаньне Віленшчыны за Польшчай.

З гэтага ўсяго відаць, што канфлікт паміж Полшчай і Літвой фактычна пакуль што астаўся яшчэ ў папярэднім стане і ліквідацыя яго ў такой меры ня лёгка, у якой меры ня лёгка для Літвы ці для Польшчы адмовіцца ад Віленшчыні.

У гэтай „мірнай" барацьбе Польшчу падтрымлівае Францыя, але Літва яўна шукае такога-ж падтрымліваньня ад Германіі, куды езьдзіў ужо пасьля Жэневы Вальдэмарас.

Што будзе далей? — Ці ўзноў завязаны польска-літоўскі „гордзіяў вузял" будзе разьвязываць Ліга Нацыяў, ці... яго прыдзецца разрубіць мячом сучасным нашым „Аляксандрам Македонскім?"

Па астанім весткам 11-га гэтага месяца польскі пасол у Рызе ўручыў у Літоўскім Пасольстве адказ польскага ўраду на ноту Вальдэмараса.

— Канец „мітрапалічага" блёку. Распачаўшы свае існаваньне у мітрапалічых пакоях „праваслаўны сьпісак", ці, як мы яго празвалі, „Мітрапалічы блёк", ужо гэта існаваньне закончыў. З трох дзеячоў, якія сталі на яго чале, (Філіп Марозаў, сьв. А. Коўш і б. сэн. Назарэўскі) астаўся толькі, здаецца, адзін, арх. Філіп, які з ніякімі выбарнымі лістамі ня выступаў. Коўш, пазбаўлены свабоды ў сувязі з працэсам „Грамады", а Назарэўскі напісаў у рэдакцыю газеты „За Свабоду" пісьмо, у якім заяўляе, што ён ня можа разам працаваць з такімі адзіознымі фігурамі як, арх. Філіп.

Як памятаюць чытачы нашы, мы ўжо прадсказывалі такую судзьбу гэтай зацее. Дзівімся толькі, што сэнатар Назарэўскі яшчэ і цяпер, здаецца, ня страціў надзеі, што ў сувязі з мітрапалітам Дзіанісіям можна штось рабіць у напрамку „увядзеньня саборнага строю" ў Царкве? — Столькі сама там можна навучыцца „саборнасьці", сколькі ў Філіпа Марозава можна навучыцца цьвёрдасьці ў праваславіі.

— У Савецкай Рэспубліцы пасьля ліквідацыі апазыцыі. Ліквідацыя апазыцыі, — высылка ў Сібір галаўнейшых аппазіцыянераў на чале с Троцкім і здача іншых, пачынаючы з Зіноўева, як відаць з газэтаў, да пакою ў СССР не прывела.

Апазыцыя прадаўжае выступаць з пратэстамі проці ўрада Сталіна, нават с тэррорыстычнымі актамі.

Нядаўна разнёсся слух, што там ужо пачалася межусобная вайна, — што ген. Тухачэўскі, які ішоў калісь на Варшаву, ідзе вайной на Маскву, якую будзе бараніць Варашылаў. Чуткі гэтыя аказаліся газэтнымі „вуткамі". Ніякай вайны там пакуль што няма. Аднака самая барацьба з апазыцыяй красамоўна сьведчыць аб тым, што камунізм і як рэальная падстава, і як ідэал жыцьця ў СССР, патроху зьніштажаецца, зыходзе з жыцьцёвай сцэны.

Пачаць бы з таго, што высланые ў Сібір з'яўляюцца „першаразраднымі"— „лявейшымі", камуністамі (Троцкі, Каменеў, Радэк, Ракоўскі, Еўдакімаў). Гэта яўна сьведчыць аб унутранім раз-

кладзе партыі, тым больш, што пачынаюць насядаць на ўрад Сталіна і прадстаўнікі камуністычнай правіцы (Рыкаў, Калінін) і жадаюць розных сацыяльна-эканамічных уступак, галоўнае—розных грамадзкіх свабод. Гэты рух падтрымліваецца рознымі народнымі паўстаньнямі.

Ці павядзе гэта да міжусобнай вайны, няведама, але бязумоўна павінна павясьці да якога небудзь новага НЭПа (новая экономічэская палітыка), да якіх небудзь новых нацыян.-сацыяльных уступакаў, на якія змушаны будзе пайсьці ўрад, каб захаваць сваю ўладу і затрымаць пераварот.

Міністэрскі крызіс у Югаславіі. — 1 лютага пашоў у адстаўку Юга-Славянскі габінэт. Прычына—выхад усіх міністраў-дэмакратаў са складу габінэту. У некаторых месцах Белграду узьніклі варужаныя сутычкі паміж палітычнымі праціўнікамі. Складаньне новага кабінэту міністраў даручана ізноў былому прэм'еру Вукічэвічу, які спрабаваў стварыць коаліцыйны ўрад (складаючыся з усіх галоўных партыяў парляманту) і запрасіў да міністэрства Радзіча (харвацкая партыя), але перагаворы пакуль што ня прывялі да нічога.

Па астатнім весткам Вукіцевічу стварыць кабінет міністраў не ўдалося, і кароль даручыў гэта Радзічу, -заўзятаму апазыцыанеру і прадстаўніку харвацкай меншасьці... Гэта зрабіла ўражаньне ў палітычных кругох ня толькі Югаславіі, але нават і Эўропы. Аднак і з Радзічам нічога ня выйшла, пасьля чаго кароль даручыў утварэньне кабінэту старшыне скупчшыны Ніко Прэлічу.

Савецка-нямецкія перагаворы. У Маскве С.С.С.Р.-ім правіцельствам апублікаваны камунікат аб бальшавіцка-нямецкіх пераворах. Мэтай гэтых перагавораў ёсьць прадоўжыць на далей торговы дагавор паміж Германіяй і С.С.С.Р. зроблены яшчэ у канцы 1925 г. Перагаворы будуць вясьціся ў Бэрліне, куды ўжо прыехалі прадстаўнікі С.С.С.Р.

Ці будзе спынена падводная вайна. З поваду астатніх катастрофаў з падводнымі лодкамі, дзе каманды патануўшых лодак згінулі страшна цяжкай сьмерцьцю(паступова задыхаліся ў працягу некалькіх дзён) Урад Амэрыканскіх Злучаных Штатаў падгатаўляе адозву да ўсіх дзяржаваў аб поўным спыненьні падводнай вайны. Палітыкі уважаюць, што гэту заяву падтрымае Англія і Германія, але проціў гэтага будуць Францыя, Італія і Японія, маючыя дужа вялікі падводны флёт.

Чэха-Славацыя пагадзілася з Ватыканам (папскі двор). Рымскі Папа і Чэхаславацкі ўрад 2 гады ня мелі ніякіх зносінаў адзін з другім. У сталіцы Чэха-Славацыі, Празе, ня было нават папскага прадстаўніка.

Прычына гэтаму была гэтакая:

Некалькі стагодзьдзяў таму назад, у Чэхіі жыў Ян Гус, які будучы, каталіцкім духоўнікам, вышаў з-пад улады рымскага папы. За гэта Яна Гуса жыўцом спалілі. І вось цяпер, калі Чэхаславацыя стала вольнаю і незалежнаю, Чэхаславацкі Народ успомніў свайго мучаніка і той дзень, у які спаліла духоўная ўлада Яна Гуса, Чэхі ўрачыста сьвяткавалі. Але-ж гэта ня падабалася рымскаму двару, які загневаўся на чэхаславацкі ўрад і з-за гэтага парваліся зносіны паміж папаю і Чэхаславацыяй.

У такім выпадку нарушаная гармонія панаваньня над духавенствам дрэнна адбівалася на дзяржаўных справах, а таксама былі замешкі і рымскаму папе ў кіраўніцтве каталіцкім духавенствам у Чэхаславацыі. Вось чаму павінны былі—Чэхаславацыя і Ватыкан зьлiквідаваць канфлікт і ўрэгуляваць адносіны паміж сабою. Так што цяпер справа ўладжана.

На гэтых днях Чэха-Славацкі ўрад апублікаваў дагавор з Рымскім Папаю, які рэгулюе граніцы епархіяў, палажэньне манахаў і рэлігійных грамадаў, а галоўнае, назначэньне чэха-славацкіх япіскапаў. Цяпер Чэха-Славацкі ўрад падае Папе сьпісак кандыдатаў на япіскапаў, Папа з іх выбірае і назначае, пры чым япіскапы прыносяць прысягу Чэха-Слав. канстытуцыі. Далей Папа прызнаў, што чэская нацыя можа дастойным чынам сьвяткаваць памяць свайго рэлігійнага рэфарматара Гуса, але каб сьвяткаваньне гэтае не абражала рэлігійнага пачуцьця каталікоў.

Беларусы! галасуйце у Сойм і Сэнат за наш № 18.

18 18

18 18

18 18

Гэту старонку разрэж на шэсьць білецікаў і імі галасуй 4-га сакавіка ў Сойм, а 11-га ў Сэнат. Лішнія білецікі аддай суседзям.

Перарыў тарговых перагавораў паміж Польшчай і СССР. У канцы студня пачаліся тарговыя перагаворы паміж Польшчай і СССР, дзеля чаго ў Маскву выехалі як дэлегаты п. п. Галуўка і Сакалоўскі. Перагаворы гэтыя перерваліся, як пішуць, з прычыны данушчанай бальшавіцкім урадам нетактоўнасьці, бо к самаму прыезду прадстаўнікоў Польшчы ў Маскву быў створаны судовы працэс кс. Скальскага, завінавачанага ў шпіанажы на карысьць Польшчы, прычым савецкія газэты пісалі, што гэтаму шпіанажу дапамагаюць польскія дыплёматычныя прадстаўнікі. Галуўка і Сакалоўскі вярнуліся ў Варшаву.

— **Пад скіпертам...** У Сувалках па вуліцах разьвешаны вялізарныя афішы, адозвы, агітуючыя за № 1, — „Блёк спулпрацы з жондам". Адозвы надрукованы на дужа дрэннай расейскай моде па новай арфаграфіі і заклікаюць каб усі, хто стаіць за „спокой" і парадак у дзяржаве **„пад скіпетром маршалка І. Пільсудскаго"** (так і надрукована), галасавялі за № 1. Што гэта? — ці нейкая правакацыя, ці безграматнасьць ня толькі граматычная, але і палітычная сувальскіх дзеячоў „спулпрацы з жондам" („Скіпетр-сымвол царскай улады).

З беларускага жыцьця.

— **Судовы працэс б. пас. Ф. Ярэміча.** 28 студня ў Вільні, аб якім мы паведамлялі ў апошнім нумары, адложаны.

— **Суд над Рагулай.** На 27 гэтага месяца ў Навагрудку вызначана судовая справа над б. пас. Рагуляй. Абвінавачываецца ён па ст. 129 за прамову, сказаную гады 3—4 таму назад на мітынгу. Бараніць яго будуць К. Аляксюк і віленскій адвакат Чэрніхаў. Сьведкамі з боку абароны вызываюць некалькі б. паслоў і сэнатараў. У тым ліку В. Багдановіч, Ф. Ярэміч, былы сэкрэтар Бел. Пас. Клюбу Більдзюкевіч і інш. В. Багдановіча, апрача таго абарона вызвала і сьведкам на суд над грамадоўцамі 23 лютага.

— **Хвароба Рэдактара „Прав. Бел."** Рэдактар „Прав. Бел." прат. Л. Голад цяжка захварэў (на плеўрыт) і ўжо трэці тыдзен ляжыць у літоўскай клініцэ.

— **Канфіската „Беларускай Крыніцы".** Па загаду камісара ўраду на м. Вільню канфіскаваны № 9 газэты „Беларуская Крыніца" за артыкул „Голас з вёскі" і заметку „Зьдзекі адміністрацыі", і № 14 за перадвыбарныя гасла*). Апрача таго сканфіскована невялічкая перадвыбарная лятучка Блёку Нац. Меншасьцяў з вершам: „За Блёк галасы".

— **Спэктакль вечарына.** У нядзелю, 5-га лютага, у салі Т-ва Беларускае Школы адбыўся спэктакль-вечарына, ладжаны Беларускім Студэнскім Саюзам. Адыграна была п'еса „Цені", твор Фр. Аляхновіча.

Бралі ўдзел у ігры артысты: Залкінд, Туркевічанка, Маскалік, Лобан і Амельяновіч.

— **Спэктакль на вёсцы.** Шутавіцкі Гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры 5 г. лютага ладзіў прадстаўленьне. Адыграна была п'еска „Зьбянтэжаны Саўка".

Пасьля прадстаўленьня адбыліся дэклямацыі і пяяліся песьні.

*) Гэтую канфіскату зьвярнулі.

Пашырайце сваю часопісь сярод праваслаўных чытачоў.

НАША ПОШТА.

С. Новіку. Swiecie n-w. На жаль ня можам Вам выслаць № 5 „Прав. Б.“ за 1927 г., бо гэты нумар увесь разыйшоўся.

Я. Пацкевічу. в. Нарэйка. Грошы атрымалі. Выслалі нумары: 6, 7, 8 і 9 поштай.

Св. Е. Ракецкаму. Сушкава. Часопісь высылаем акуратна. Трэбуйце з пошты. На жаль № 4 увесь разыйшоўся. Запытайцеся у Вашай вёсцы можа хто дастаў лішні. Дасылаем №№ 6, 7, 8 і 9 поштай.

Прат. П. Сасноўскаму. Вы а. пратаіерэй пішыце, што ў Вас няма чытачоў на „Правасл. Беларусь“. Каго-ж у Вас няма: ці праваслаўных, ці беларусаў?

А. І. Б—ю. Часопісь Вам высылаем акуратна трэбуйце з пошты. Усе недастаючыя нумары выслалі з маркамі. На жаль ня можам даслаць № 4 і 5, бо усе выйшлі.

Упраўл. Жыровецкага манастыра. „Прав. Бел.“ высылаем акуратна. Трэбуйце на сваей пошце. Цяпер даслалі з маркамі №№ 1 (7), 2 (8) і 3 (9).

АБВЕСТКІ.

РЭДАКЦЫЯ просіць сваіх чытачоў прысылаць падпісную плату і трэбаваць „Праваслаўную Беларусь“ на сваіх поштах. Высылаем акуратна. У мэце пашырэньня часопісі Рэдакцыя абнізіла плату з 2 зл. 50 гр. да 2 зл. за 1/4 года. Тым падпішчыкам, якія прыслалі ўжо за першую 1/4 года 2 зл. 50 гр. Гэтыя 50 гр. будуць залічаны на наступны квартал.

ЗЬМЕСТ.

Рэдактар-выдавец: Л. Голад. Друк. ім. Ф. Скарыны, Людвісарская 1.